# СЛОВА Ў ТЭКСЦЕ

НАЗОЎНІК

# ЛЕКСІКА-ГРАМАТЫЧНЫЯ РАЗРАДЫ НАЗОЎНІКАЎ

**Назоўнікі**

| | |
|---|---|
| **агульныя** (завод, студэнт) | **уласныя** (Еўропа, часопіс «Маладосць») |
| **адушаўлёныя** (верабей, журналіст) | **неадушаўлёныя** (чарніцы, армія) |
| **канкрэтныя** (коўдра, навальніца) | **абстрактныя** (гонар, падпіска) |
| **зборныя** (птаства, алешнік) | **рэчыўныя** (аспірын, торф) |

# ЛІК НАЗОЎНІКАЎ

**Толькі адзіночны лік**

- рэчыўныя назоўнікі (*масла, жалеза*)
- зборныя назоўнікі (*зерне, студэнцтва*)
- абстрактныя назоўнікі (*гумар, сумленне*)
- уласныя назоўнікі (*Свіслач, Салігорск*) і інш.

**Толькі множны лік**

- назвы састаўных і парных прадметаў (*акуляры, нажніцы*)
- назоўнікі, якія абазначаюць сукупнасць чаго-небудзь (*бацькі, фінансы*)
- назвы з агульным рэчыўным значэннем (*дрожджы, духі*)
- назвы адрэзкаў часу, звычаяў, свят, гульняў (*прыцемкі, хованкі*)
- уласныя назоўнікі (*Асіповічы, Філіпіны*) і інш.

# РОД НЕСКЛАНЯЛЬНЫХ НАЗОЎНІКАЎ

| Мужчынскі род | Жаночы род | Ніякі род |
| --- | --- | --- |
| • назвы асоб мужчынскага полу (*буржуа*)<br>• назвы мужчынскіх прафесій (*аташэ*)<br>• назвы жывых істот (*какаду*)<br>• уласныя назвы гарадоў, астравоў (*Батумі* – як назоўнік *горад*) | • назвы асоб жаночага полу (*пані*)<br>• уласныя назвы рэк, гор, пустынь (*Місісіпі* – як назоўнік *рака*) | • неадушаўлёныя назоўнікі (*радыё*)<br>• уласныя назвы азёр (*Антарыа* – як назоўнік *возера*) |

# РОД АБРЭВІЯТУР

| | | |
|---|---|---|
| Нескланяльныя абрэвіятуры | род вызначаецца па апорным слове | БДУ – Беларускі дзяржаўны **ўніверсітэт** – м.р. |
| Скланяльныя абрэвіятуры | род вызначаецца па склонавых канчатках | ЛіМ – газета «Літаратура і мастацтва» - ЛіМ**а**, ЛіМ**у**, ЛіМ**ам** – м.р. |

# ТЫПЫ СКЛАНЕННЯ НАЗОЎНІКАЎ

### 1 скланенне

- ж.р., канчаткі **-а** (**-я**): *калыханк**а**, вішн**я***

### 2 скланенне

- м.р., нулявы канчатак: *учынак, тэкст;*
- н.р., канчаткі **-о** (**-ё**), **-а**, **-е**: *акн**о**, паветр**а***

### 3 скланенне

- ж.р., нулявы канчатак: *радасць, любоў*

### не ўваходзяць ні ў адзін тып скланення

- рознаскланяльныя назоўнікі (*качаня, бацька*);
- нескланяльныя назоўнікі (*таксі, Баку*);
- назоўнікі, якія маюць форму толькі множнага ліку (*дзверы, апілкі*)